***З. У. Шведава, А. М. Палуян***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# РОЛЯ ПЕДАГАГІЧНАГА ПРАКТЫКУМУ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ

Якасная падрыхтоўка будучых настаўнікаў немагчыма без павышэння ўзроўню практыка-арыентаванага навучання. Таму адным з важнейшых інструментаў фарміравання прафесійных кампетэнцый будучага педагога з'яўляецца ўвядзенне ў вучэбны працэс філалагічнага факультэта ГДУ імя Францыска Скарыны факультатыўнай дысцыпліны "Педагагічны практыкум" для студэнтаў 3 курса спецыяльнасці "Беларуская філалогія".

Педагагічны практыкум арганізуецца пасля вывучэння студэнтамі курсаў педагогікі і псіхалогіі паралельна з вывучэннем курсаў методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры і ставіць на мэце знаёмства студэнтаў-філолагаў з арганізацыяй працэсу навучання ў сярэдняй школе, методыкай правядзення ўрокаў беларускай мовы і літаратуры, кантролем за самастойнай работай, крытэрыямі ацэнкі ведаў і ўменняў вучняў, афармленнем метадычнага матэрыялу і дакументацыі па будучай педагагічнай практыцы.

Валоданне тэарэтычнымі ведамі пра заканамернасці развіцця, навучання і выхавання дзяцей, прынцыпы, змест, метады, формы навучання і выхавання дазволіць студэнтам асэнсавана і кваліфікавана ажыццяўляць назіранні за вучэбна-выхаваўчым працэсам у сярэдняй школе. Паралельнае наведванне лекцыйных і практычных заняткаў па методыцы выкладання мовы і літаратуры і ўрокаў у сярэдняй школе будзе садзейнічаць сувязі тэорыі з практыкай, асэнсаванню студэнтамі прынцыпаў, зместу і спосабаў арганізацыі прафесійнай дзейнасці настаўніка ў сучасных умовах, фарміраванню ўменняў назіраць і аналізаваць некаторыя формы арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў сярэдняй школе.

Мэтанакіраванае назіранне, аналіз вучэбна-выхаваўчага працэсу, вывучэнне педагагічнага вопыту

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дапамагаюць больш глыбока разабрацца ў складаных пытаннях педагагічнай тэорыі, садзейнічаюць развіццю педагагічнай назіральнасці. Акрамя таго, авалоданне методыкай назірання як адным са спосабаў навуковага даследавання істотна і для фарміравання даследчыцкага падыходу да педагагічных з'яў, удасканалення якасцей творчай асобы.

Студэнты павінны навучыцца ў працэсе мэтанакіраванага назірання заўважаць і асэнсоўваць станоўчы вопыт у рабоце настаўніка, каб потым прымяніць яго ў далейшай прафесійнай дзейнасці; ажыццяўляць аналіз урокаў мовы і літаратуры з мэтай асэнсавання крытэрыяў іх ацэнкі; пазнаёміцца з канкрэтнымі ўмовамі арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў сярэдняй школе: з афармленнем кабінета беларускай мовы і літаратуры, з вучэбнымі праграмамі, падручнікамі, вучэбнымі і метадычнымі дапаможнікамі па прадмеце, з каляндарным і каляндарна- тэматычным планаваннем.

Асноўная мэта назірання – заўважыць і асэнсаваць станоўчы вопыт у працы настаўніка, каб потым выкарыстаць яго ў працэсе актыўнай педагагічнай практыкі на 4 курсе і ў далейшай прафесійнай дзейнасці.

У час назіранняў метадычнага характару студэнты ажыццяўляюць запісы па наступнай схеме:

1. Дата назірання, школа, клас, месца ўрока ў раскладзе вучэбнага дня; прозвішча, імя, імя па бацьку настаўніка; колькасць вучняў, якія прысутнічаюць на ўроку.
2. Тэма ўрока. Месца гэтага ўрока ў агульнай сістэме ўрокаў па тэме (высвятляецца папярэдне).
3. Мэта ўрока (высвятляецца ў настаўніка перад пачаткам урока).
4. Падрыхтаванасць да ўрока (афармленне дошкі, стан працоўных месцаў вучняў, падрыхтаванасць школьнікаў да ўрока і г. д.), абсталяванне.
5. Пратакольны запіс урока з аналітычным каментарыем:

| Этап урока | Дзейнасць настаўніка | Дзейнасць вучняў | Каментарыі |
|---|---|---|---|
| | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | |

При абмеркаванні наведанага ўрока звяртаецца ўвага на:

– важнасць правільнага вызначэння мэты ўрока; выбар тыпу і структуры ўрока, метадаў і прыёмаў навучання ў залежнасці ад мэты ўрока, зместу праграмнага матэрыялу, асаблівасцей вучняў пэўнага класа і г. д.;

– разуменне навучання як двуадзінага працэсу, дыялагічнага ўзаемадзеяння настаўніка і вучняў;

– захаванне прынцыпаў навучання і выхавання на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

Праводзіцца аналіз урока прыкладна ў такой паслядоўнасці:

1) якім быў пачатак урока (дысцыпліна, гатоўнасць вучняў да ўрока, мабілізацыя ўвагі школьнікаў);

2) наколькі эфектыўнымі былі матывацыя вучэбнай дзейнасці школьнікаў, актуалізацыя апорных ведаў, праверка дамашняга задання;

3) наколькі мэтазгодны і эфектыўны былі метады і прыёмы азнаямлення вучняў з новым матэрыялам, ці была пастаноўка праблемы;

4) як было арганізавана замацаванне ведаў і фарміраванне ўменняў і навыкаў:

а) ці выкарыстоўваліся метады замацавання ведаў;

б) ці ўлічваўся пры падборы практыкаванняў прынцып градацыі ад простага да складанага, ад калектыўных форм работы да самастойных, ці было заданне творчага характару;

в) наколькі мэтазгодна выкарыстоўваліся разнастайныя віды практыкаванняў;

г) ці адпавядаў дыдактычны матэрыял мэце ўрока;

д) у якой ступені і якімі шляхамі ажыццяўлялася дыферэнцыяцыя заданняў;

е) ці ажыццяўлялася работа па фарміраванні культуры маўлення школьнікаў і інш.;

5) як падводзіліся вынікі ўрока;

6) якім быў характар дамашняга задання (адпаведнасць мэце ўрока, інструктаж, дыферэнцыяцыя і г. д.);

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

7) як ажыццяўлялася ацэнка ведаў, уменняў і навыкаў вучняў (віды, формы, сістэма ацэнкі), наколькі аб'ектыўнай была ацэнка;

8) ці эфектыўна прымяняліся на ўроку разнастайныя сродкі навучання;

9) якім быў тэмп урока;

10) якая была псіхалагічная "афарбоўка" ўрока, стыль узаемаадносін настаўніка з вучнямі;

11) ці была дасягнута мэта ўрока.

У час такіх абмеркаванняў студэнты асэнсоўваюць крытэрыі ацэнкі ўрокаў, намячаюць той ідэал урока, да якога павінен імкнуцца кожны настаўнік. У працэсе педагагічнага практыкуму рэкамендуецца наведаць урокі розных тыпаў: урок засваення новых ведаў і развіцця ўменняў; урок замацавання ведаў і фарміравання ўменняў і навыкаў; урок абагульнення і сістэматызацыі ведаў і ўдасканалення ўменняў і навыкаў; камбінаваны ўрок; урок паўтарэння; урок развіцця маўлення; кантрольны ўрок; урок работы над памылкамі і інш.; паказаць, што спалучэнне структурных элементаў вызначае тып урока.

Паколькі педагагічны практыкум рыхтуе студэнтаў да будучай пераддыпломнай практыкі на 4 курсе ў школе, то адным з этапаў яго правядзення з'яўляецца знаёмства студэнтаў з этапамі арганізацыі будучай практыкі і афармленнем штодзённай і справаздачнай дакуметацыі. Студэнтаў неабходна пазнаёміць з вядзеннем дзённіка практыкі, схемай напісання канспекта ўрока, структурай справаздачы. Асаблівую ўвагу надаць афармленню дзённіка практыкі ці, дакладней, падрыхтоўцы дзённіка да будучай практыкі. Паказаць, што дзённік складаецца з пяці раздзелаў, растлумачыць сутнасць і патрабаванні да запаўнення кожнага раздзела.

Такім чынам, факультатыўная дысцыпліна "Педагагічны практыкум" дае практычную магчымасць студэнтам, з аднаго боку, пазнаёміцца з вучэбна-выхаваўчай работай школы, у цэлым, і, у прыватнасці, работай настаўніка і класнага кіраўніка, з другога боку, свядома падрыхтавацца да праходжання пераддыпломнай практыкі на 4 курсе. Да таго ж, педагагічны практыкум спрыяе ўзрастанню ў студэнтаў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

узроўню прафесіянальнай накіраванасці асобы будучага настаўніка (цікавасць і матывацыя да педагагічнай прафесіі, здольнасць да самарэгуляцыі, самаадукацыі, гатоўнасць да няспыннага прафесійнага самаўдасканалення, выяўленасць такіх прафесійных якасцяў, як любоў да дзяцей, самастойнасць, ініцыятыўнасць, адказныя і творчыя адносіны да работы і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ